Pierasyłka apłačana ryčałtam

Nr. 42 (635). **Wilnia, Niadziela 10 Listapada 1935 h.** **Hod XI (XIX)**

БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i litaraturnaja hazeta.

Adras Redakcyi i Administracyi: WILNIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1). Redakcyja adčyniena ad 9 hadz. ran. da 4-aj uwieč.

HAZETA WYCHODZIĆ RAZ U TYDZIEŃ.

Košty wydawańnia pakrywajuć składki. Składka u hod 4 zał., na paŭhoda — 2 zał., na 3 miesiacy — 1 zał.

ЯПОНІЯ АРГАНІЗУЕ МАНГОЛАЎ

Ужо даўно ведамыя палітычныя пляны Японіі. Сутнасьць іх у тым, што гэтая культурная азіяцкая дзяржава імкнецца арганізаваць палітычна і культурна азіяцкія народы мангольскай расы, да якой і сама належа. Пачатак ужо зроблены. Ад некалькі гадоў, дзякуючы захадам Японіі, пад яе апекай існуе самастойная дзяржава Манджурыя. Ад некалькіх тыдняў тая-ж Японія часьць Манголіі абвесьціла так-жа як незалежную дзяржаву.

Манголія — гэта дужа вялікі край. Ляжыць між Кітаем, Манджурыяй і Сібірам. Займае 3.360.000 кв. клм. Усіх манголаў у Манголіі якіх тры міліёны, а рэшта кітайцы, расейцы і інш. каляністы і асаднікі. Манголы — гэта ня ёсьць адналіты народ, яны дзеляцца на розныя плямёны, як у самай Манголіі, так і ў іншых краёх Азіі. Злучае іх ў вадну цэласьць пачуцьцё аднэй расы, агулам адна будыйская вера і часткова супольнасьць эканамічных інтарэсаў у працівенстве да ўсіх эўропэйцаў, якія нажываюцца коштам азіятаў. Край гэты ў некаторых мяйсцох вельмі багаты: ёсьць золата, серабро, медзь, вугаль. Але гэта ўсё яшчэ ня выкарыстана і насельніцтва жыве даволі бедна. Займаецца пераважна гадоўляй быдла, коней, вярблюдоў, авец. Манголы маюць свой асобны язык, сваё пісьменства, культуру.

Гісторыя Манголіі дужа старадаўная і цікавая. Край гэты на працягу вякоў — ад ст. XII—XIV — быў незалежнай дзяржавай. У ст. XVII Манголія была заваяваная Кітаем. З гэтым сумным для сябе фактам яна ніколі не пагадзілася і заўсёды шукала дарог да незалежнасьці.

Сяньня Манголія ёсьць падзелена між суседзямі. Самая паўдзённая часьць Манголіі, ці, як яе звычайна называюць, унутраная, у большасьці належа яшчэ да Кітаю. Але тут ужо ад некаторага часу штораз больш чуюцца гаспадарамі японцы, якія нядаўна ў усходняй частцы гэтай краіны, дзе налічаецца да двух міліёнаў манголаў, аб‘явілі Манголію незалежнай дзяржавай пад сваей, ведама, апекай.

На поўнач ад Унутранай Манголіі ляжыць так зв. Зьверхняя Манголія. Гэтая краіна яшчэ ў 1911 г. карыстаючы з тагочаснай рэвалюцыі ў Кітаі абвесьціла сябе незалежнай дзяржавай. Урэшце сталася яна толькі аўтаномнай адзінкай у Кітаі. Зьверхняя Манголія ў 1919 г. ўзноў прабавала стацца цалком незалежнай. Дапяць ёй гэтага аднак аканчальна не ўдалося. Праўда, гэта краіна сяньня на паперы лічыцца незалежнай народнай дзяржавай, але фактычна поўным гаспадаром там СССР.

Яшчэ больш на поўнач, аж пад самы Сібір, на граніцы СССР, ляжыць часьць Манголіі: Танну-Тува, так-жа ў тэорыі як незалежная рэспубліка, а фактычна як расейская калёнія.

На ўсход ад Танну-Тува, ужо ў Сібіры, знаходзіцца яшчэ адна часьць Манголіі, якая ўваходзіць у склад СССР, як аўтаномная савецкая, сацыялістычная рэспубліка пад назовам «Бурято-мангольская», з сталіцай Верхнеудінск.

Урэшце апошняя частка Манголіі — правінцыя Мэн Люнг-Тсянг, з сталіцай Цыцыкар, належа да Манджурыі.

Ня гледзячы на гэту раздробленасьць, народна-культурныя і палітычна-вызвольныя імкненьні ў Манголіі ня спыніліся, надварот: дзякуючы заборчым суседзям узмагліся яшчэ больш. Ведама, Манголія сама чуецца слабой і для асягненьня сваіх мэтаў шукае саюзьнікаў. Быў час, калі такім саюзьнікам Манголія ўважала царскую, а пасьля савецкую Расею. Сяньня гэта ўжо належа да мінуўшчыны, Манголія цяпер ар‘ентуецца на Японію. Гэтая дзяржава патрапіла здабыць давер у манголаў, відаць затым, што прапагуе ідэі лучнасьці і супрацоўніцтва між народамі мангольскае расы. Надта магчыма, што Японія будзе далей рэалізаваць свае пляны і прыдзе час, калі ўся Манголія будзе аб‘яднаная ў вадну незалежную дзяржаву, якая будзе існаваць у саюзе з Японіяй.

Гэткая японска-мангольская палітыка на далёкім усходзе ня можа астацца без значэньня і на лёс беларускага народу. Гэткая палітыка аблягчае барацьбу за сваю незалежнасьць з маскоўскага панаваньня народам Туркестану, Каўказу, а так-жа Украіне і Беларусі.

Думку гэту мы ўжо калісьці выказвалі пры нагодзе разгляду вызвольных імкненьняў каўкаскіх народаў і ведаем, што за гэта мы мелі на бачынах савецкай прэсы шмат на нас нападкаў. Нічога не парадзіш, праўда не заўсёды і ня кожнаму прыемная. Калі гэта аднак мы яшчэ паўтараем, дык робім гэта дзеля таго, каб прыпомніць Саветам, што замест нацыянальнага, палітычнага, рэлігійнага і эканамічнага ўціску сваіх народаў, павінны яны тасаваць прынцыпы вольнасьці і справядлівасьці. Мы так выказваемся затым, што мы стаім за саюз народаў не фікцыйна вольных і незалежных, як сяньня ёсьць з Савецкай Беларусяй і іншымі краінамі, але за саюз народаў сапраўды вольных і незалежных, за саюз народаў, апёрты на ўзаемнасьці, роўнасьці і міжнароднай справядлівасьці. І толькі гэткаму саюзу народаў ня страшны ніякія манголы...

Фінляндзкая вёска

Праф. К. Гурскі апісвае культуру фінляндзкага сяла гэтак:—На першы ўзгляд фінляндзкі краявід, калі аглядаць яго праз вакно вагону, або аўтамабілю, не адкрывае ўсіх рысаў свайго характару.

Амаль усюды узгорысты краявід, многа лугоў, хвойных лясоў, добра абробленае поле, дзераўляныя будынкі, памаляваныя на цёмна-чырвона—любы колер жыхароў поўначы. У Швэцыі таксама хаты, маляваныя гэтым самым колерам. Гэты коляр надта добра гарманізуе з цёмна-зялёным фонам усяго краявіду.

З лясістага ўзгорку я аглядаў сапраўдную эгзотычную рысу фінляндзкага краявіду: куды вокам ня кінеш — вазёры. Фінляндыя мае іх некалькі тысячаў, малых, вялікіх і аграмадных.

Хто ведае, ці ня выдаецца нам Фінляндыя яшчэ болей эгзотычнай краінай, калі заглянемо ў сярэдзіну сялянскіх хатаў. Адведаў я некалькі земляробскіх гаспадарак.

Хата, як усюды, дзераўляная, вонкавым выглядам нічога надзвычайнага не выказвае. Абстаноўка ў хаце паказвае культуру яе жыхароў. Даволі вялікая бібліятэка, у габінэце гаспадара тэлефон, дзьве машыны да рахаваньня, адна машына да пісаньня, многа газэт і журналаў. Селянін выпісвае 5 газэт.

У ніжэйшай часьці хаты, што месьціцца ў высокай падмуроўцы, стаіць печ цэнтральнага агграваньня, там устроена лазьня, пральня і падобн. выгоды. Асьвятленьне ўсюды электрычнае.

Аглядаю стайню і хлявы: чысьценькія, як салён. Падлога і жолабы бэтоновыя. Апрача гэтага камфорту і гігіены, з якіх карыстаюць коні і каровы, ёсьць яшчэ спэцыяльныя круглыя пасудзіны на ваду. У глыбіне гэтакай пасудзіны месьціцца рэшатца, якое мае аўтаматычны кран; калі конь або карова апускае ў гэту судзіну галаву, каб напіцца, націскае мордай рэшата і судзіна напаўняецца сьвежай вадой.

Аглядаючы гэта, пытаю—колькі гаспадар мае зямлі. Адказывае, што мае 6 гэктараў ворнай, троха лугу і лесу. Ня веру і думаю, што можа гэта дасьледчая фэрма, уфундаваная дзеля прапаганды. Аглядаю другую фэрму. Тое самае, што ў першай фэрме. —

Гэтак жывець культурная вёска на далёкай поўначы, дзе і зямля горшая, чымся ў нас, і клімат зімнейшы. Фінляндцы маюць сваю незалежную дзяржаву. Фінляндцаў ёсьць толькі 5 з палавінай міліёнаў.

Я. М.

Z polskaj unutranaj palityki

Paśla adstaŭki ŭradu Słaŭka i ŭtwareńnia nowaha ŭradu na čale z premjeram Kaściałkoŭskim, u polskaj unutranaj palitycy pradbačacca źmieny sposabaŭ prawodžańnia jaje.

Apazycyjnyja hazety ćwierdziać, što adstaŭka ŭradu Słaŭka — heta jaŭnaja pieramoha nad hrupaj „pałkoŭnikaŭ", jakaja dasiul, ža žyćcia maršałka Piłsudskaha, była pry kiraŭnicy ŭnutranaj polskaj palitykaj.

Kali premjer Kaściałkoŭski z daručeńnia Prezydenta twaryŭ nowy ŭrad — pišuć apazycyjnyja hazety — u sojmawych pakojach zasiadała inšaja hrupa, jakaja starałasia paraližawać dziejnaść nowaha ŭradu.

Urad, na čale z premjeram Kaściałkoŭskim, užo ŭstabilizawaŭsia — Sojm i Senat na prapazycyju ŭradu dali Prezydentu dziaržawy poŭnamoctwa wydawać dekretami zakony.

Krytyka ŭradawaj haspadarčaj prahramy.

Prahrama haspadarčaj palityki polskaha ŭradu, ab jakoj my pisali ŭ prošłym numary, wyklikała ŭ polskich kruhoch roznajakuju krytyku. I ničoha dziŭnaha — hetaja prahrama ŭradu začaplaje intaresy roznych hrupaŭ, a niekatorych i ŭ wialikim raźmiery. Arhanizawanyja hrupy, što reprezentujuć polskich „chłopów", pryniali ŭradawuju prahramu prychilna, a tyja hrupy, što reprezentujuć promysieł, handal i bujniejšuju ŭłasnaść, adnieślisia da haspadarčaj prahramy ŭradu krytyčna.

Polskaja apazycyja ŭ swaich krytyčnych uwahach ab haspadarčaj palitycy ŭradu zaznačaje, što ŭrad ničoha nowaha nia prydumaŭ u hetaj sprawie i budzie prawodzić dalej tuju-ž staruju palityku papiarednich uradaŭ.

Amnestyja.

Amnestyja ŭ Polščy ciapier aktualnaja. Damahajucca jaje palaki, damahajucca ukraincy, damahajucca biełarusy i litoŭcy. Ab amnestyi pišuć ciapier mnoha ŭ hazetach, pisali ab joj i raniej. Za amnestyju wykazaŭsia nawat i sam ministr sprawiadliwaści Michałoŭski jašče ŭ habinecie ŭradu premjera Słaŭka. Ciapier u ministerstwie sprawiadliwaści hatowiać **prajekt zakonu amnestyi**.. Amnestyja maje abniać nia tolki zwyčajnych prastupnikaŭ, ale tak-ža i wiaźniaŭ palityčnych, a tak-ža maje abniać i pakaranych administracyjnymi ŭładami.

Padrobnaści zakona-prajektu amnestyi jašče nia wiedamy. Wiedama tolki toje, što ministerstwa sprawiadliwaści pradłažyła ŭžo prajekt amnestyi ministerstwu ŭnutranych spraŭ dziela zaapinijawańnia, i wiedama, što ŭrad padaść hety prajekt u Sojm na budžetnaj sesii, jakaja maje pačacca ŭ paławinie hetaha m-ca.

Haspadarčyja dekrety.

Hazety padajuć, što ŭ suwiazi z paŭnamoctwami Prezydenta wydawać dekretami zakony ab naprawie polskaj dziaržaŭnaj haspadarki i ahułam u sprawie ekanamična-haspadarčaj palityki Polščy, — prajekty hetkich zakonaŭ užo ŭrad maje hatowyja i zaraz adzin pa druhim jany buduć abwiaščacca jak dekrety. Ministr skarbu ŭ Senacie kazaŭ, što „nowy kurs" haspadarčaj palityki dasiahnie ŭsich, paciašajučy, što „nie na doŭha".

Pažywiom — pabačym.

240352

Беластоцкая старонка

Беласток паложаны каля этнаграфічнай Польшчы. Ад Беластоку да этнаграфічнай Польшчы ня больш 20 кілямэтраў. Беласток гэта адзін з найбольшых местаў у Зах. Беларусі і зьяўляецца найбольш прамысловым у ёй пунктам.

Насельніцтва нашага Беластоку надта рознаякае — беларусы, палякі, маскалі і інш., а найбольш жыдоў. Беластоцкі промысл — суконныя фабрыкі, гарбарні, тартакі, гуты шкляныя і жалезныя і розныя майстроўні — блізу ўвесь у руках жыдоў. Работнікі — беларусы, палякі і крыху маскалёў.

Ваколіцы Беластоку чыста беларускія — кругом жывуць сяляне беларусы.

„Dom Prawosłaŭny."

Беларуская група „prawosławnych polaków"—Савіцкі, Ярчак, Шутка — залажылі *„Dom Prawosławny,"* для „православных полякув" у Беластоку і яго ваколіцах.

Тут трэба адзначыць, што ані ў Беластоку, ані ў беластоцкіх ваколіцах „православных полякув" няма. Праваслаўныя ў беластоцкіх ваколіцах — беларусы, а ў Беластоку—наездныя маскалі, ёсьць украінцы і нашыя, тутэйшыя беларусы. Група „православных полякув" — гэта беластоцкі новатвор, які зфармаваўся так-жа з чужацкасьці—з астачы у Беластоку маскоўскай царкоўнай культуры, якая была засяваная так-жа на чужым грунце і разьвіцца тут належна не магла.

„Dom Prawosławny" для „православных полякув" мае на мэце праводзіць у царкоўна-рэлігійнае жыцьцё мяйсцовага праваслаўнага насельніцтва польскую мову. Словам, мейсца расейшчыны ў царкве, для гэтых „православных полякув," мае заняць польшчына.

Беластоцкія „православні поляцы" стараліся моцна ажывіць сваю дзейнасьць — зьбіралі сярод работнікаў і служачых подпісы за ўвядзеньне польскай мовы ў царкву і падавалі мэморыялы ў гэтай справе праваслаўнай духоўнай ўладзе і дзяржаўнай ваяводзкай адміністрацыі. У рэзультаце прыбыў у Беласток малады попік, акадэмік, які і ўзяўся навучаць праўды Божай „православных полякув" папольску. Аднак у практыцы аказалася, што ніхто, апрача заклад-чыкаў *„Domu Prawosławnego"* для „православных полякув", у Беластоку ў царкоўным жыцьці польскай мовы ня хоча. Маладому попіку ўсе згодным хорам заяўлялі — „Вашасьць нам не патрэбны!"

„Dom Prawosławny" ўжо наладзіў два сходы сваіх сяброў. На першым сходзе гаварылі аб ідэолёгіі гэтага „Domu". Тыя сябры, што спраціўляліся ідэолёгіі „Domu Prawosławnego," прыкл. Язэп Госьцін, нядаўна перайшлі ў беспработныя!..

Беларусы, нам ані расейшчына, ані *„Dom Prawosławny"* да асягненьня ідэалу абвешчанага Актам 25 сакавіка не па дарозе. А нашая мэта абазначана гэтым Актам, які вырашае нашую справу нацыянальную і соцыянальную. Дык закладайма свае, беларускія арганізацыі.

Аб Т.Б. Ш.

У Беластоку ў 1927 годзе паўстала беларуская арганізацыя Т-ва Беларускае Школы (Т.Б.Ш.). Ад пачатку гэтая арганізацыя не магла належна праявіць сваей дзейнасьці, пакуль не адпаў элемэнт нездольны да творчай працы. Калі на мейсца элемэнту дэструкцыйнага прыйшлі людзі працы, што ўмеюць працаваць на роднай глебе, народная праца Т.Б.Ш. пачала разьвівацца.

У 1928 годзе Беласток пачуў роднае беларускае слова і з сцэны. Пачалі ладзіць беларускія прадстаўленьні, канцэрты і іншыя імпрэзы ў Беластоку і ў беластоцкіх ваколіцах. Многім гэткая праца ТБШ. была „не наруку," дык адны стараліся „ўзарваць" Т.Б.Ш., а другія шукалі спосабу спыніць беларускую народную дзейнасьць у ТБШ. Беларускія народнікі на гэтую варожую дзейнасьць у Т.Б.Ш. глядзелі, як на пераходнае зло і спадзяваліся, што арганізацыя ад шкоднікаў ачысьціцца і тады стане на цьвёрды народны грунт. Але зло аказалася даволі сільным і яно зусім спаралізавала нашу арганізацыю. У канцы—ТБШ. у Беластоку зьліквідавана.

* * *

Цяжка беластоцкім беларусам без сваей арганізацыі. У польскія „Domy Prawosławne," або ў расейскія арганізацыі беларусы ня йдуць, бо яны нашаму, беларускаму работніку чужыя формай і зьместам. Беларускім работнікам патрэбная свая арганізацыя, беларуская. Нашыя работнікі аб гэтым думаюць і часта гавораць. Беларускай арганізацыі ў Беластоку многія чакаюць.

К. С.

Litoŭskaja Encyklopedyja

(Žmienia ŭražańniaŭ).

Tolki što skončyŭ ja prahladać dahetul wyšaŭšyja try tamy Litoŭskaj Encyklopedyi: A—Ats, Ats—Bat, Bat—Boh i pačatkawyja sšytki čaćwiertaha tomu. Lažać jany prada mnoj na biurku i ciešać majo woka. Maładaja Litwa, što pačała ad tydniowikaŭ, čytanak i kalendaroŭ, siańnia užo z hordaściaj moža ahladać pryhožyja pačatki ŭłasnaj litoŭskaj encyklopedyi. Z tworčaj swajej žyćciowaści Litwa zdała ekzamin duža dobra. Zdała jaho tak, jak zdaje małady, zdolny, pracawity i staranny student. Jość heta swajho rodu dyplomowy ekzamin.

Try tamy, kožny pa 1534, padzielenyja na dźwie, bačyny. Tamy hrubyja, strojna ilustrawanyja, dobry druk i dobraja papiera. Litoŭskaja Encyklopedyja prypaminaje padobnyja wydańni zahraničnyja, jak napr. herderaŭski niamiecki *Konversationslexikon,* abo amerykanski *The Catholic Encyclopedia.* Hetak pawažna wyhladaje Lit. Enc. zatym, što ŭ skład redakcyi ŭwajšli ŭsie biaz wyniatku hałoŭnyja intelektualnyja litoŭskija siły. Wartaść hetkaha supracoŭnictwa kožnamu jasnaja.

Nia maju namieru pisać tut recenziju ci krytyku Litoŭskaj Encyklopedyi, a tolki ahułam adznačaju, što na jaje bačynach znajšli i peŭnie buduć znachodzić miejsca tak-ža i mnohija biełaruskija proźwiščy i tyja, što z žyćciom biełaruskim majuć takuju ci inšuju łučnaść.

Ahladčyk.

Дня 1-га сьнежня сёл. ў залі БІГіК у Вільні адбудзецца

АКАДЭМІЯ

ушанаваньня памяці беларускага вучонага этнографа Нікіфароўскага, з прычыны прыпадаючых сёлета 25-тых угодкаў ягонай сьмерці. Акадэмію арганізуе Бел. Інстытут Гасп. і Культуры. Праграма будзе падана пазьней.

„Źmiena taktyki UNDO"

(Z ukrainskaj palityki ŭ Polščy)

Ukrainski pasoł u polski Sojm W. Celewič pračytaŭ u Lwowie publičny referat ab sučasnaj ukrainskaj palitycy UNDO. Referat mieŭ nazoŭ: „Źmiena taktyki UNDO".

Pasoł Celewič, miž inšym, skazaŭ nastupnaje:

Kab paŭstała ŭkrainskaja dziaržawa, treba wajny, bo historyja dakazwaje, što nowyja dziaržaŭnyja arhanizmy paŭstawali tolki ŭ časy wajennych zawiaruchaŭ, da taho-ž treba razwału dziaržawy, u jakoj najbolšaja ukrainskaja terytoryja — Sawietaŭ. Świet padzialiŭsia na worahaŭ i pryjacielaŭ Sawietaŭ i ukrainskaja palityka musić šukać sajuźnikaŭ u worahach Sawietaŭ. Heta ciapier Anhlija, Niamieččyna i Polšč. Užo z hetaha ŭzhladu Polšč patrebnaja i prociŭ jaje nia treba ukraincam wieści wostraj palityki.

Druhoje: Pawajennyja dziaržawy nakładajuć ruku na ŭsio žyćcio hramadzian. Hetak jość u najwastrejšaj formie ŭ Sawietach, u Italii, u Niamieččynie. U Polščy da taho jdzie. Mnohija zakony (samaŭradawy, školny, ab tawarystwach, kooperacyi, małačarstwie) pakazwajuć, što ŭ hetym kirunku jdzie pastupowa akcyja. Heta hraziła ukrainskim ustanowam poŭnaj likwidacyjaj, jakuju treba było ŭstrymać. Dziela hetaha ŭ krasawiku sioleta pačalisia narady z pradstaŭnikami polskaha ŭradu. Najlepšym wychadam z pahrozy likwidacyi była-b aŭtanomija, jakaja hwarantawała-b poŭny razwoj našaha žyćcia, heta jość padstawaj našaha dziaržaŭnaha budaŭnictwa na wypadak ci to wajny, ci razwału Sawietaŭ."

Woś pryčyny ŭkrainska-polskaj uhody, jakuju zakłučyła UNDO z pradstaŭnikami polskaj ułady i jakuju pasoł Celewič nazywaje „źmienaj taktyki UNDO".

Na naš pahlad, hetkaja „źmiena taktyki" nadta-ž uzaležniła niezaležnickuju palityku UNDO ad intaresaŭ polskaj palityki nia tolki ŭ Zach. Ukrainie, ale i wa Uschodniaj jaje čaści. Wyraźniej — lejcy niezaležnickaj palityki UNDO pieradany ŭ ruki palityki polskaj.

Uznoŭ streł u prawasłaŭnaha światčeńnika na Wałyni

Hazety padajuć hetkuju wiestku: — u siale Krymzi, Kowelskaha pawietu, azbrojenyja napaśniki napali na prawasłaŭnaha świaščeńnika, miajscowaha parocha a. Płatona Rafalskaha, i wystrełam z rewolwaru ciažka jaho ranili; raniena tak-ža i žonka świaščeńnika.

Sioleta heta ŭžo treci wypadak napadu na prawasłaŭnych świaščeńnikaŭ na Wałyni. Ab papiarednich, zabojstwach, my pisali, i padawali ich pryčyny. Pryčyny apošn'aha napadu jašče niawiedamy.

Biełaruskaja moładź prosić biełaruskich lemantaroŭ i knižak

Naša redakcyja atrymała z w. P—ry, D—kaj wołaści, Nawahradzkaha pawietu piśmo-memoryjał ad biełaruskaj moładzi, u jakim moładź prosić biełaruskich knižak i biełaruskaha lemantara. Piśmo henaje adrasawana wydaŭcu našaj hazety. Drukujem jaho tak, jak jano napisana.

„Prosim łaskawa dziadźku A. Šutowiča prysłać nam, kali łaska i kali jość, biełaruskich knižak, biełaruskich lemantaroŭ i choć jakich knižak u biełaruskaj mowie, kab tolki zaspakoić naš hoład u biełaruskich knižkach.

My biełaruskaja moładź chodziačy ŭ polskuju škołu pa niekalki hadoŭ nia možam zrazumieć ichniaj hutarki. My biełaruskija dzieci, pračytali ŭ „Biełaruskaj Krynicy" hazetku „Praleski", jakaja ŭzrušyła našaje maładoje serca.

My razumiejem, što čytajučy biełaruskija knižki i hazety my dawiedwajemsia, što my ŭ świecie značym i jak dajści da lepšaha žyćcia.

My ŭsie supolnym hołasam prosim usich našych biełaruskich dziejačoŭ nie adkazać łaskawa našaj prośbie".

17 roznacharatarnych podpisaŭ.

Ad redakcyi: Darahaja moładź. Kolki zmožam i jakija budziem mahčy knižki Wam dać, biezadkładna wyšlem. Biełaruskaha lemantara my nia majem. Wyšlem wam zamiest lemantara „Пішы самадзейна". Wy na dobraj darozie i starajciesia, kab nia źbilisia z pućcia. Wučyciesia, praświačajciesia, dyk i nia zbłudzicie.

Dr. Stanisłaŭ Hrynkiewič.

Aświeta.

2)

(Ab Narodnym Uniwersytecie i inšych sposabach aświetnaje pracy).

Kožny narod maje swoj asabliwy padychod da prablemy zaškolnaje aświety. Kožnaje hramadzianstwa zaležna ad patreby dnia maje swaju aryhinalnuju formu pracy nad aświetaju.

Z isnujučych formaŭ henaje aświety, biaručy najbolš raspaŭsiudžanyja, možam adciemić hetkija:

I. Kursy dziela darosłych. II. Lekcyi ŭ cyklach. III. Narodnyja uniwersytety.*) IV. Papularnyja uniwersytety. V. Školy haspadarčyja. VI. Niadzielnija uniwersytety. VII. Letnija kursy karespandencyjnyja. IX. Biblijateki. X. Biblijateki-čytalni. XI. Arhanizacyi moładzi i arhanizacyi sportyŭnyja. XII. Narodnyja damy. XIII. Narodny teatr. XIV. Muzykalnyja hurtki. XV. Chory. XVI. Radyjo. XVII. Hazety. XVIII. Wystaŭki. XIX. Wandroŭki turystystyčnyja. XX. Daśledčyja adumysłowyja pracoŭni majstroŭni. XXI. Kursy instruktarskija i h. p.

*) Tutaka koratka skažu, što z pajmom Narodnaha Uniwersytetu spałučana ŭ mianie wyklučna tolki Narodn. Un. Grundtvigaŭskaha typu.

I. Kursy dziela darosłych.

Tutaka najważniejšaja meta nawučyć darosłych čytać i pisać. Kožny wiedaje siańnia wialikuju patrebu j nieabchodnaść umiectwa samomu pračytać. Ważnaja heta sprawa chacia-b dziela tolki praktyčnych miarkawańniaŭ.

Samatužna možna wielmi šmat u henaj halinie zrabić. Kožny hramatny moža nawučyć swajho susieda ci znajomaha prostym chatnim sposabam. Mahčyma heta ŭsiudy i zaŭsiody, asabliwa doŭhimi, zimowymi wiečarami. Ujawim sabie tolki heny pryhožy abrazok. Nadworje mokraje, chałodnaje, u chacie kala stała siadzić mužčyna dy pry dapamozie kuma, znajomaha ci na't syna imkniecca razhadać tajnicy, schawanyja ŭ knižcy...

Pracu takuju lahčej rabić arhanizawanym sposabam u ramach taje ci inšaje z isnujučych arhanizacyjaŭ. Treba było-b, kab henyja arhanizacyi parupilisia wydać adpawiednyja instrukcyi, kab wyklikali patrebnuju atmasferu, kab zaachwocili, kab adnym słowam pawiali źwierchu henuju akcyju.

Miž inšym karyść hetkaje pracy jašče ŭ tym, što jana miłaja, adnej i druhoj staranie pakidaje pa sabie toje asabliwaje siabroŭstwa pamiž „wučniam" i „wučycielam", što z henych časowych adnosinaŭ astajucca ślady i mahčymaści dziela dalejšaje supolnaje pracy hramadzkaje i kulturnaje.

II. Lekcyi ŭ cyklach.

Forma pracy aświetnaje zdajecca najbolš prostaja i najlahčejšaja. Čytać lekcyi moža čaławiek zdalok, moža zaŭsiody jon prywiaźci z saboju prykłady palahčajučyja i wyklikajučyja bolšaje zacikaŭleńnie temaju lekcyi, prykładam u formie abrazkoŭ, mahičnaje latarni i h. d.

Ad čytajučaha lekcyi takija majem dawoli wialikija wymohi. Taki čaławiek, kab moh zacikawić słuchačoŭ, kab moh pakinuć bolšyja śledamki ŭ halinie rozumu j pačućcia, treba kab mieŭ zdolnaść krasamoŭčuju. Nia treba na heta wialikaha aratara. Časta dobry aratar nia ŭmieje paciahnuć za saboju ludziej, dziela taho, što nia wiedaje, jak zakranuć toje, što najważniejšaje, što najhłybiej siadzić u dušy j sercy čaławieka. Drenna padhatawany prelehent abo wykliča krytyku, abo znieachwocić ludziej da hetakaje pracy na budučynu.

Na't jość pahlady, što praca ŭ formie lekcyjaŭ mała karysnaja, što jana lišnie pawiarchoŭnaja. Adnak nia zusim prawilna. Karyści na't adnaje lekcyi nadta wialikija. Lekcyi najlahčej dastupnyja, nia treba na ich wialikich koštaŭ. Adzin prelehent moža absłužyć bolšuju terytoruju. Čaławiek, nia prywykšy da natuhi intelektualnaje, umiecimie na hadzinu adnu druhuju pryłamacca, kab chacia pačatna pryniać nowyja dziela jaho dumki, idei, wiestki.

З Савецкай Беларусі

Калектывізацыя ў цыфрах. „Зьвязда“ з дня 22.X. 35 падае, што ў сёлетнім годзе ў калгасы БССР „уступіла“ 100 тысяч бяднацка-серадняцкіх гаспадарак. На 1-га кастрычніка процант калектывізацыі ў БССР складае 85,3 супроць 72.6 проц. на 1-га студня. У БССР налічваецца 10 877 калгасаў. Сярэдні разьмер калгаса ў сучасны момант — 61 двор замест 50 двароў на 1-га студня.

Паказённаму. У тымсамым нумары, рэдакцыя „Зьвязды“ робіць агляд пісьмаў калгасьнікаў і сьцьвярджае, што ў калгасах няма барацьбы са стратамі, што там — працуюць паказённаму.

Пісьмы калгасьнікаў характэрныя. Перадрукоўваем іх з «Зьвязды,“ зазначаючы, што іх „Зьвязда“ поўнасьцю не надрукавала (шкада!). — Калгасьнік калгаса „Зорка,“ Ясавецкага сельсовета (Петрыкаўскі раён) піша:

„Наш калгас узяў паравую малатарню ў соўгасе „Чарноцкім.“ Яна вельмі дрэнна працавала: пускала цэлы колас, бо ў барабане выбіты 4 зубы, і многа зярна пайшло ў салому. Праўленьне калгаса на гэта ніякай увагі не зьвярнула.“

— У калгасе „Чырвоны Акцябр“ Высоцкага сельсовета (Шклоўскі раён) пры малацьбе кала 30 проц. ільняных галовак асталося ў мякіне, — пішуць калгасьнікі.

— У калгасе «Большэвік,“ Баеўскага сельсовета (Крычаўскі раён), пры малацьбе коннымі малатарнямі ў саломе асталося многа ячменю. У гэтым-жа раёне не вядуць барацьбы ня толькі са стратамі, а таксама не даюць рашучага адпору кулацкім (бяда з гэтымі кулакамі! – рэд. „Б. Кр.) антымэханізатарскім настроям кіраўнікоў некаторых калгасаў. —

МТС па заключанаму дагавору з калгасамі раёна павінна была абмалаціць калгасам 3 600 гэктараў зернавых. Работа выканана напалову. Малатарні працуюць з няпоўнай нагрузкай...

...Ня менш важнай справай зьяўляецца захаваньне саломы пасьля абмалоту.

У калгасе імя Молатава, Саладухінскага сельсовета, згноена 48 коп саломы. Старшыня калгаса Жукаў увесь час п'янствуе і зрывае работу ў калгасе, — піша калгасьнік Л. М. Калгасьнік калгаса „Новая зара“ Пухаўскага сельсовета (Грэскі раён), С. П. піша:

„Пасьля абмалоту зярна ў нашым калгасе салома і мякіна кінута пад дажджом,і расьцягваецца кім папала. Старшыня калгаса ніякіх мер ня прымае.“

У іншым месцы „Зьвязда“ друкуе карэспандэнцыю з Мсьціслаўшчыны, у якой сказана, што „кулакі(!), пралезшыя на ільназавод“— падвялі старшыню калгаса імя Кірава, у выніку чаго «устаноўлена толькі, што з 16.5 гэктара ільнотраста пагніла на сьцелішчы.

...Няма ніякіх сумненьняў,—кажа карэспандэнт, — што і ў калгасе запраўляюць класавыя ворагі. Гэта пацьвярджаецца і тым, што ў калгасе размеркавалі ўраджай, не разьлічыўшыся з дзяржавай за работу трактараў, што пры капаньні бульбы ў зямлі астаецца процантаў 30.“

У суседнім калгасе „Бальшавік Мсьціслаўшчыны“ —паводле тагож карэспандэнта дзеецца вось што: „У мінулым годзе было раскрадзена 1000 пудоў зернявых, ды і цяпер старшыня калгаса Вертліб гаворыць, што начным вартаўнікам ня верыць, а правяраць начную варту баіцца каб не забілі(!). На гэтым выгравае кулак(?!) Рыбакоў Рыгор; ён падабраў шайку зладзеяў і раскрадае калгас. Нядаўна калгасьнікі выключылі Рыбакова з калгаса, але райвыканком аднавіў яго“...

Гэта адны з многіх фактаў, якія падае „Зьвязда“. Характэрныя яны тым, што сьведчаць, як паказённаму працуецца ў калгасах, якая грамадзкая моральнасьць „будаўніка“ соцыялізму на грунце гаспадарчым —у калгаснай весцы, і як увасім вінаваты „кулакі“!

Беларусы не даюць бульбы. Як прыклад эксплёатацыі беларусаў маскоўскімі бальшавікамі падаём наступныя факты. «Зьвязда“ ад 12.X 35 г. — піша (у артыкуле пад крыклівым загалоўкам „Зрываюць адгрузку бульбы Ленінграду“): — „Рад паўночных раёнаў БССР ганебна зрываюць адгрузку бульбы Ленінграду. Найбольшую нядбайнасьць (ці нядбайнасьць?— рэд. „Б. К.) праяўляюць лёзьнянскія загатоўчыя арганізацыі.“

Трэба думаць, што тут ня звычайная нядбайнасьць загатоўчых арганізацыяў, а што тут маем дзела з барацьбой беларусаў супроць эксплёатацыі маскоўскіх бальшавікоў: беларусы ня хочаць даваць бульбы Ленінграду.

„Чыстка.“ Як па ўсім Савецкім Саюзе, так і ў БССР праводзілася раней і цяпер праводзіцца ачышчаньне радоў камуністычнае партыі і савецкіх арганізацыяў ад ненадзейных і контрэвалюцыйных элемэнтаў. А гэных элемэнтаў многа ёсьць, ёсьць яны ў „вярхох“ і „ўнізох.“ Ёсьць спасярод гэных элемэнтаў і такія, што за свае для бальшавікоў заслугі атрымалі адзначэньні — напр. „ордэн працоўнага чырвонага сьцяга.“

Дня 12.X. абвешчана ў „Зьвязьдзе“ пастанова Цэнтр. Выканаўчага Камітэту БССР з дня 11.X.35 аб „вывадзе са складу членаў“ гэтага-ж Камітэту Сільвестрава Р. І., „як выхадца з кулацкай сям'і (так і сказана!) і абмануўшага партыю і совецкую ўладу.“

Сільвестраў Р. І, таго самага дня ЦВК БССР—дзеля тых самых прычын—пазбаўлены „ордэна працоўнага чырвонага сьцяга БССР.“

Відаць кепская справа у бальшавікоў, калі ўжо трэба ачышчаць цэнтральныя ўлады ад бальшавіцкіх шкоднікаў з „ордэнамі працоўнага чырвонага сьцягу“, чаго прыкладам вышэйпададзены факт!...

Другі факт. Чытаем у „Зьвязьдзе“ з 22.X.35 г.—„Пастановай Парткалегіі Камісіі партыйнага кантролю пры ЦКВКП(б) ад 27 верасьня 1935 г. *Дунец* Хацкель Майсеевіч, год нараджэньня 1897, член ВКП(б) з 1920 года (п. б. № 08172251), да гэтага 7 гадоў быў членам яўрэйскай буржуазнай партыі „С С.,“ з дробнабуржуазнай сям'і, у апошні час быў нам. наркомасьветы БССР, нач. галоўмастацтва і рэдактар газэты „Літаратура і мастацтва,“ у сучасны момант — культработнік заўкома — ...з радоў ВКП(б) выключан.“

За што? За тое, што Дунец „працягаваў у друк трацкісцка-зіноўеўскую контрабанду,“ — „за стварэньне групаўшчыны, сямейнасьці і кругавой парукі сярод асобных яўрэйскіх пісьменьнікаў..“ і за „як ня зжыўшага буржуазнага нацыялізма“ (так сказана ў матывах пастановы).

Трэба ведаць, што Дунец у свaім часе ня мала даўся ў знакі т. зв. бел. нацдэмам, ён іх выкрываў і рабіў усякія на іх даносы, у прэсе і іншым спосабам.

Аж тут маеш! „Нёс воўк — панясьлі і ваўка.“ Запраўды, зьменны і няпэўны лёс у Саветах, нават і для „заслужаных“ камуністаў!

З Беластоку

— Ходзяць чуткі, што ў Беластоку мае зарганізавацца „Беларускі Народны Тэатр,“ які стала будзе ладзіць беларускія прадстаўленьні, каб заспакоіць духовыя патрэбы мясцовых беларусаў.

Калі гэтыя чуткі не фантазія духова галодных беларусаў, дык вітаем культурны пачын на рубяжы нашага Краю і жадаем плоднай працы.

— Насупроць «спраставаньня“ Горадзенскай Праваслаўнай Кансысторыі у № 39 „Бел. Крыніцы,“ што ў Беластоку няма польскага праваслаўнага прыходу, факт паказвае наступнае:

У Беластоку пры саборы сьв. Мікалая ёсьць адумысловы духоўнік для г. зв. „православных поляков,“ каторы ў кожнае сьвята і ў нядзелі а гадзіне 9 раніцы адпраўляе службу Божую папольску.

Пры гэтым трэба адзначыць, што беластоцкія беларусы, як праваслаўныя так і каталікі, рэлігійным жыцьцём надта мала цікавяцца. Чужая мова і чужы беларусам дух у царкве і ў касьцеле да рэлігійнага--царкоўнага, або касьцельнага жыцьця не прыцягвае.

— Беластоцкія беларусы цяпер ня маюць ніякай арганізацыі. Патрэбу арганізацыі беластоцкія беларусы адчуваюць моцна. Адна група беларусаў падала ўжо заяву аб зарганізаваньні гуртка Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры ў Беластоку.

Трэба тут зьвярнуць увагу беластоцкіх беларусаў аб патрэбе ў Беластоку беларускай бібліятэкі, або пункту беларускай літаратуры, дзе можна былоб даставаць беларускія кніжкі і газэты. Аб гэтым трэба падумаць.

С—віч.

Japonija ŭ Kitaju

Paśla ŭtwareńnia niezaležnaj Mandžuryi, japonskaje wojska zaniało dźwie prawincyi paŭnočnaha Kitaju — Čahar i Džehol. Hetyja kitajskija prawincyi, paśla zaniaćcia ich japoncami, „abwieścili“ siabie niezaležnaj manholskaj dziaržawaj.

Heta pakazwaje, što Japonija dalej prawodzić swaju palityku ŭ Kitaju, wyciskajučy adtul usialakija ŭpływy Rasiei, palityčnyja i ekanamična-haspadarčyja.

Niezaležnaść hetych krain Manholii heta tolki wonkawaja forma japonskaj tam palityki, a ŭ sapraŭdnaści heta toje samaje, što i niezaležnaść Mandžuryi.

Japonskaja, apošnich časaŭ, palityka ŭ nutranoj Manholii moža pryśpiašyć wajnu z Sawietami. Nowaja manholskaja dziaržawa, biazumoŭna, budzie imknucca, kab pryłučyć da swajej terytoryi i wonkawuju Manholiju, z jakoj utworana sawieckaja respublika i jakaja znachodzicca pad uładaj maskoŭskich kamunistaŭ.

U abiedźwiuch hetych čaścinach Manholii, — što pad Sawietami i ŭ Kitaju pad Japonijaj,—ciapier budzicca pačućcio nacyjanalnaje. Hetym manholskim nacyjanalnym adradžeńniem achwotna karystajucca ŭ swajej palitycy Sawiety i Japonija. Jany starajucca pieraciahnuć, chto da siabie, sympatyi i prychilnaść manhołaŭ. Pierawaha hetkaj prychilnaści manhołaŭ zaŭważwajecca na staranie Japonii.

Tworačy niezaležnaść Manholii, Japonija starajecca adnačasna dajści da dobraj zhody z Kitajem.

Japoncy chočać zusim wycisnuć z Kitaju ŭpływy Eŭropy i Ameryki, pradusim ekanamična-haspadarčyja i finansawyja i prawieści źmienu palityčnuju i haspadarčuju ŭ Kitaju swaimi siłami, biaz učaścia Eŭropy i Ameryki. Kitajski nankinski ŭrad zusim prystaje da hetkich namieraŭ Japoni

Arużny napad na kitajskaha premjera.

Nadowiačy ŭ nankinskim parlamancie dakanany arużny napad na premjera kitajskaha nankinskaha ŭradu Ven Gerin-Veja. Napaśnik aryštawany. Jon zajawiŭ, što pastanawiŭ zabić premjera, kab hetak zapratestawać suproć japonskaj palityki kitajskaha ŭradu.

Hazety padajuć, što hety napad na premjera Kitaju byŭ inspirawany balšawikami.

Japoncy damahajucca demilitaryzacyi Amuru?

Japoncy prawodziačy swaju palityku ŭ Kitaju wyciskajuć adtul rasiejskija ŭpływy i starajucca jak najdalej adapchnuć adtul uładańni i siłu Rasiei.

Hazety pišuć, što apošnimi časami japonskija wajskowyja palityki stawiać damahańnie demilitaryzacyi lewaha bierahu Amuru, dzie najmacniejšyja sawieckija krepaści i dzie najsilniejšy punkt sawieckaj abarony na Dalokim Uschodzie. Heta, prosta kažučy, damahańnie, kab Sawiety adtul dabrawolna wystupili.

Japonija, jak bačym, zawodzić swaje paradki ŭ Azii i mahčyma, što „ŭparadkawaŭšysia“ ŭ Kitaju nie pakinie biez swajej uwahi i Sibiru. Ale, pakul nie „ŭparadkujecca“ ŭ Kitaju, z Sawietami zadziracca nia budzie.

Heta moža jaho raskałychać, razhornie jahonuju dušu da samastojnaje pracy ŭ budučynie.

III. Narodnyja uniwersytety.

Nazoŭ narodnaha uniwersytetu chawaje ŭ sabie wielmi roznajaki źmiest. Ahułam narodnym uniwersytetam zawuć roznyja formy aświetnaje pracy, u ramach henaje ŭstanowy ładziać kursy dla analfabetaŭ, wiaduć lekcyi na wielmi wysokim roŭni. Wiaduć lekcyi systematyčnyja, kursy pradmietaŭ paasobnych, prykładam kursy rodnaje mowy, kurs matematyki i h. d.

IV—VI. Papularnyja uniwersytety.

Časta pa haradoch isnujuć h. zw. papularnyja uniwersytety, dzie jduć u światočnyja dni hetkija ci inšyja lekcyi. Z metaju spałučyć miłaje z karysnym na hetkim uniwersytecie ładziacca supolnyja hulni tawaryskija, z tym, kab z hulniaŭ astałasia niejkaja bolšaja karyść. Z hetakich hulniaŭ nadta časta mohuć pačacca arkiestry, chory i h. d. Biazumoŭna, hulnia nadta patrebnaja, jaje nia možna nikoli wykinuć z prahramy kulturnaje akcyi. Sprawa tolki ŭ tym, kab usieńka na hulni nia končyłasia, kab tutaka byŭ pačatak šyrejšaha hramadzkaha žyćcia.

Narod, asabliwa moładź, zaachwociŭšysia da supolnaje pracy, prywučajecca da bolš systematyčnaje pracy. Wiedama, što z hetkich kursaŭ pačynalisia rehularnyja kursy haspadarčyja ci inšyja. U takoj pracy patrebny ŭžo plan, kab wykarystać naležna ŭsie mahčymaści ŭ daŭžejšym praciahu času.

VII. Letnija kursy.

Wielmi papularnyja siarod žycharoŭ wialikich haradoŭ. Ludzi sabirajucca supolna prawieści adzin dzień i tolki, ci na't daŭžejšy čas, i tam u hramadzie namiačajuć plan pracy, kab skarystać i na zdaroŭi i na dušy. Jasna, henyja letnija kursy mahčymyja j na wioscy. Patrebnaja tolki dumka, świedamy padychod, rupliwaść nakirowanaja ŭ henuju staranu. Wioska maje stolki žyćciowa ważnych temaŭ, što i ŭletku paśla taho, jak usie pamalilisia, mohuć, sabraŭšysia na niekalki hadzin, supolna papracawać.

VIII. Kursy karespandencyjnyja.

Meta hetkich kursaŭ — heta dać mahčymaść raskidanym daloka adzinkam, daloka ad centru, znajści krynicu i pomač u samastojnaj pracy. Hetkija kursy bačym najčaściej u suwiazi z praktyčnymi pytańniami. U našym biełaruskim žyćci bačyli my ŭžo niekalki sprobaŭ henaje pracy i jak pakazywajuć arhanizatary kursaŭ (kursy kooperatyŭnyja, pčalarskija) efekty mieli wielmi dobryja Dla šmat kaho heta adzinaja mahčymaść dapoŭnić swaju wiedu ci nawučycca niečaha nowaha. Nijakaja knižka nie zastupić kursaŭ. U lekcyjach na kursach inšy padychod da temy, padychod heny bolš indywidualny, raskład źmiestu bližejšy da žyćcia, da praktyčnych patrebaŭ.

Jasna, što kursy karespandencyjnyja mohuć cikawać nia tolki ab čysta praktyčnych temach. Eŭropa a jašče bolš Ameryka wiedaje daŭno ŭžo henyja kursy, na ich ludzi prachodziać školy siarednija i na't wysokija, dastajuć dyplomy i hetkim čynam mohuć paprawić swoj los žyćciowy.

Kursy razciahiwajucca zaŭsiody na niekalki miesiacaŭ. Pry kožnaj lekcyi na kancy jość praktyčnyja rady, pytańni. Usieńka heta prymušaje da samastojnaje pracy kursanta.

U Polščy jość kursy karespandencyjnyja haspadarčyja, majučyja wialikuju za saboju praktyku, i biazumoŭna sučasnaja niezaležnaść dziaržaŭnaja ad časci źjaŭlajecca śledamkaju zdajecca na pahlad hetkich mała widawočnych natuhaŭ achwiarnych ludziej, i tych, što pisali lekcyi, i tych, što wučylisia na kursach.

Roznyja wiestki

Z UKRAINSKAHA ŽYĆCIA.

1-Listapadawy Dzień. Što-hod Ukraincy ūračysta abchodziać 1-Listapadawy Dzień.

Paśla abwieščańnia niezaležnaści Ukrainy 22 studzienia 1918 h. u toj čaści Ukrainy, što była pad Rasiejaj, 1 listapada 1918 hodu byū dakanany ukraincami pierawarot u Haliččynie, jaki zadakumentawaū addzialeńnie ūkrainskaj Haliččyny ad Aūstryi i pryłučeńnie jaje da uspomnienaj wyšej čaści Ukrainy.

Hety 1-Listapadowy Dzień uračysta abchodzili ū Haliččynie ukraincy i sioleta.

Z POLŠČY.

Likwidacyja B.B. Na źjeździe staršyniaū i sekrataroū wajawodzkich arhanizacyjaū B.B., što adbyūsia 30 min. m-ca ū Waršawie, staršynia partyi B.B. pałk. Sławek zajawiū, što B.B. užo nie patrebnaja. Utrymliwańnie sekretaryjataū B.B. užo bieskarysnaje. Užo jość nowaja konstytucyja, i nowaja wybarnaja ordynacyja, pawodle jakoj stworany tak-ža Sojm i Senat.

Biespartyjny Blok heta mieū za zadańnie i jaho wykanaū.

Słowam, B.B. užo niepatrebnaja.

Z ZAHRANICY.

Pierabudowa Lihi Narodaū. Anhielski ūrad hatowić prajekt pierabudowy Lihi Narodaū i spadziajecca, što tyja dziaržawy, jakija ciapier nie naležać u Lihu, paśla jaje pierabudowy ūstupiać u Lihu Narodaū.

Widać, Anhlii chočacca ūciahnuć u Lihu Niamieččynu, Japoniju i Zł. Št. Ameryki. — Hazety padajuć, što japonski ūrad reformaj Lihi Narodaū zusim nia cikawicca. Japoncy ūwažajuć, što Liha Narodaū heta eūrapejskaja sprawa, jakaja ciapier mała cikawić Japoniju.

U Hrecyi manarchija. Nadowiačy ū Hrecyi adbyłosia ahulnaje narodnaje hałasawańnie. Hałasawańnie rašała, jaki ū dziaržawie zawieści ład. Najbolš padana hałasoū za manarchičny ład. Takim čynam u Hrecyi wiarnułasia manarchija.

Francyja adwaročwajecca ad Sawietaū. U Francyi zaūważwajecca ūzrost publičnaj apinii prociū Sawietaū, apinii, jakaja maje ūpływy i na zahraničnuju francuskuju palityku. Francuskija kamunisty namahajucca zrabić nacisk, kab francuski ūrad padbaū ab ratyfikacyju parlamantam francuska-sawieckaha dahaworu.

Mir Baliwii z Parahwajem. Kolki-hadowaja wajna miž Boliwijaj i Parahwajem (na amerykanskim kontynencie) užo zakončana. Mirnaja konferencyja ab źlikwidawańni boliwijska-parahwajskaj wajny abwieściła aficyjalnuju deklaracyju miru abiedźwiuch hetych dziaržaū.

Narady ū Lizie Narodaū ab ustrymańni italijanska-abisynskaj wajny. Liha Narodaū stwaryła dziela ūstrymańnia italijanska-abisynskaj wajny specyjalny kamitet, jaki składajecca z 18 pradstaūnikoū. Hety Kamitet 18-caci adłažyū zapačatkawańnie sankcyjaū prociū Italii da 18 h. m. i starajecca znajści sposab „pamiryć" Italiju z Abisynijaj.

Z wajennaha frontu ū Afrycy. Hetymi dniami italijancy pačali nowy nastup na abisyncaū i pawoli pastupajuć napierad zabirajučy miesty Abisynii. Nadowiačy italijancy zaniali abisynskaje m. Makalle.

USIAČYNA

Siła abisynskaj armii. Abisynskaja armija składajecca z dźwiuch niaroūnych čaściej. Adna čaść — heta wojska, azbrojenaje ciapierašniaj zbrojaj, umieje paciapierašniamu wajawać. Hetkaha wojska maje Abisynija tolki kala 100 tysiač.

Druhaja čaść abisynskaj armii — heta masa ludziej azbrajena prymityūnaj zbrojaj, — umieje wajawać tolki „wajak-na wajaka".

Najbolšaja siła abisynskaj armii — heta dobra znany abisyncam teren, swojskaść klimatyčnaja i patryjatyčnaje pačućcio.

Nowaja cukroūnia ū Litwie. Sioleta zasnawana ū Litwie ū Marjampoli druhaja cukroūnia, jakaja moža pierarabić na cukar 60 tysiač tonaū burakoū. Ciapier litoūskija cukroūni mohuć pierarablać na cukar 150 tysiač tonaū burakoū štohod. Litwa asiahaje ū cukroūnictwie poūnaje zaspakajeńnie patreb Kraju.

Strašnaja katastrofa. U Lan-Čan u prawincyi Ken-Su—u zachodnim Kitaju — nadowiačy zdaryłasia strašnaja katastrofa ū składzie wybuchowych matarjałaū. Wybuch byū strašny. Zhinuła kala 100 ludziej. Aficyjalny kamunikat kaža, što katastrofu spryčynili kamunisty. Wybuch źniščyū usio nawokał u promieni 2 kilametraū. 10.000 ludziej pazbaūleny strachi nad haławoj.

Z KRAJU.

Sud za letnija zabureńni ū Horadni. U červieni sioleta byli ū Horadni zabureńni. Ciapier, 4 h. m. pačaūsia ū Horadni ū hetaj sprawie sud. Žydy hety sud nazywajuć pracesam „pahromščykaū". Sprawa pradstaūlajecca, mienš-bolš, hetak:

U adnej „tancbudcy" 5 červienia žydy Štejner i Kantaroūski zabili nažami Uładysława Kušču. Sud zabojcaū zasudziū — adnaho na 12 hadoū, a druhoha na 4 hady katarhi. Ale paūstała druhaja sprawa, jakaja ciapier razhladajecca akružnym sudom u Horadni. A imienna.

U dwa dni paśla zabojstwa Kušču chawali. Na pachowiny sabrałasia niekalki tysiač narodu. Chaūturny pachod uzburyūsia... i ū rezultacie było 2 zabitych, 13 asob ronienych, u 183 žydoūskich damoch i 83 kramach pabity wokny i naroblena mnoha inšych matarjalnych stratаū.

Ciapier adbywajecca sud. Na ławie zasieła 17 abwinawačanych; paklikana 54 świedkaū.

Abwinawačanyja na pytańni adwakataū-žydoū ničoha nie adkazwajuć —bajkatujuć žydoū. Ab wynikach pracesu padadziom u nastupnym numary.

Z WILNI.

Zaduški. Pryhoža abchodziać u Wilni dn. 2.XI. świata pamioršych, Zaduški. Tradycyjnaje adwiedywańnie mahiłaū źjaūlajecca hramadzkim abawiazkam. Biełarusy tak-ža adwiedywajuć swaich pamioršych. Sioleta pa prykładu minułych hadoū nad mahiłami Kazimira Swajaka i Jadwihina Š. na Rosie wilenskija biełarusy prapiajali choram biełaruskija relihijnyja pieśni.

Kanfiskata. Polskija ūłady dziaržaūnaj administracyi 1.XI. siol. skanfiskawali Nr. 33 litoūskaj hazety „Vilniaus Žodis" za artykuł „Za padniaćcie ruki — 875 zł".

Купляйце!

Цана аднаго экзэмпляра 50 грошаў. Хто адразу купае ад 10 да 25 календароў, плаціць 40 гр., ад 25 да 100 календароў — плаціць 37 гр., 100—300—35 гр., 300—1000—33 гр. за штуку.

Галоўны склад: Беларуская Кнігарня „П А Г О Н Я" Вільня, Завальная вуліца № 1—1.

Пісьмы з вёскі

Хомічы, Дзісьненскага пав. Мікалаеўскай вол. У нашым кутку глуха — ніякае культурнае працы тут няма. А затое, як сьвята падойдзе, паміма таго, што людзі бедныя, п'яных поўна і то пераважна п'яная моладзь. У вольны ад працы час моладзь і старэйшыя дзень і ноч граюць у карты. Гледзячы на гэта, робіцца дужа сумна. Моладзь нашая ня мела і ня мае роднай школы, але многія ўмеюць чытаць у роднай мове. Вучацца саматугам. Таксама недахват беларускіх газэт і кніжак. Хоць мала сьвятла пранікае ў наш куток паўночнай Дзісьненшчыны, але і тут ёсьць зародкі змаганьня за лепшае заўтра.

Моладзь наша хоць ня мае сваіх арганізацыяў, але і ў польскія не запісываецца. У нас часта польская шляхта і асаднікі, або вучыцялі ладзяць прадстаўленьні, але ніхто туды з нашай моладзі ня йдзе. Ня йнакш адносіцца нашая моладзь і да расейскіх папоў, якія зусім адпудзілі людзей ад царквы.

Заклікаю нашую моладзь кінуць кепскія налогі. Нам трэба ўзяцца за культурную працу: трэба залажыць гурток Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры, трэба ладзіць прадстаўленьні, трэба адкрыць бібліатэку-чытальню, трэба выпісаць свае газэты, кніжкі і навязаць сталую карэспандэнцыю з рэдакцыяй „Беларускай Крыніцы." І так памаленьку навучымся і мы, як трэба жыць.

Да працы моладзь! Блiскi.

Асташына, Навагрудзкага пав. За 7 кілямэтраў ад м. Любча, якое ляжыць над ракой Нёманам, шырока разляглася нашая вёска Асташына. Вялікая нашая вёска— мае 212 хатаў, якія ўдоўж праз два кілямэтры стаяць абапал дарогі і гэтак твораць доўгую вуліцу. У канцы вёскі стаіць 4-тырох аддзялова пачатковая беларуская школа; у воддалі другі будынак, у якім таксама вучацца дзеці.

Моладзі ў нашай вёсцы многа, але яна штосьці прыснула... Тры гады таму назад было шмат вясялей — быў у нас гурток ТБШ., была бібліатэка чытальня і моладзь прасьвячалася, разьвівалася; ладзілі беларускія прадстаўленьні ня толькі ў сваёй вёсцы, але і ў суседніх вёсках. Бібліатэка папаўнялася штораз усё новымі кніжкамі, а моладзь новыя кніжкі ахвотна чытала. Праца кіпела.

У 1932 закрылі наш гурток ТБШ. Пасьля закрыцьця гуртка былі арышты і многіх арыштавалі западозрыўшы ў іх камунізм. Сумна было тады ў вёсцы, ах як сумна!.. Каля 12 асоб дасюль яшчэ сядзіць у вастрозе.

Моладзь не павінна падаць духам, моладзь павінна жыць і разьвівацца. Трэба нанова наладзіць беларускую народна-культурную працу. Трэба ўзноў ставіць беларускія прадстаўленьні. Гэта рабіць можна і гэтага нам ніхто не забароніць. Прадусім трэба нашай моладзі зарганізавацца. Закладаймa гурток Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры, а пры гуртку адчынім бібліатэку і пачнём культурна-асьветную рaботу. А. Ч.

Miadźwiedzičy, Baranawickaha paw. Na hałasawańnie ū Sojm u našaj wołaści nia nadta rupilisia. Byli wioski, katoryja zusim nie chacieli jści hałasawać, ale što-ž, kali chadzili pa wioskach „ahitatary" i strašyli ludziej roznymi pratakołami i štrafami, a ū dzień wybaraū chadzili pa chatach i, paprostu, wyhaniali.

U dzień wybaraū našyja biednyja wiosački „doznali zaščytu" ahladać wysokija chwihury ū asobach zastupnika starasty i „jaho ekscelencyi pana" wojta, katoryja raźjaždžajučy pa wioskach na aūtamabili prasili ludziej, kab išli na hałasawańnie. Choć raz „wysokapastaūlenyja chwihury" dy prasili mužykoū!..

Adnak ludzi nia nadta pasłuchali ich prośbaū. Adno adna wioska Hajniniec nadta-ž prychilna adhuknułasia na ich prośby. Ale moža i jana adniasłasia b da hetaj sprawy inačaj, kab nie paddałasia ūpływu wučyciela Maroza, i kab čytała swaje biełaruskija hazety.

Nie adrečy budzie tut skazać, što choć polskaja presa (bebekaūskaja) i pisała, što sioletnija wybary buduć biez ahitacyi, to adnak, nia hledziačy na heta, zasypywali našyja wioski roznymi „Nowinami", „Kalendarzem Polskim" i inšymi brašurami, u katorych ničoha nia było haspadarskaha, a tolki pisali pra wybary.

Tady, kali hetyja polskija brašury swabodna „spacyrawali" pa wioskach, našaja rodnaja „Biełaruskaja Krynica" hdzieści „supačywała" i nie mahła pakazacca.

„Bieł. Krynicy" za 5-ty wierasień my i dahetul nie ahladali, a hety numar, wiedajem, wyjšaū i nie skanfiskawany. ja.

Naša pošta.

K. S—ču. Atrymali, dziakujem, karystajem, pišycie čaściej. Ab carkoūnych sprawach, unutranaha charaktaru, drukawać nia budziem, bo hetkija sprawy našaj, biełaruskaj sprawy nie datyčać.

Z Astašyna. Za prysłanaje dziakujem, drukujem; pišycie čaściej, achwotna budziem drukawać.

Dawidowiču. Piśmo atrymali, prośbu spoūnim — knižak padašlom.

Rabotnikam z Staūpeččyny. Piśmo Wašaje atrymali i dziwimsia, što Wy i prostaje sprawy nie razumiejecie. My nidzie, nikoli nia pisali, što B.Ch.D. adkazywajecca supracoūničać z inšymi biełaruskimi arhanizacyjami, i nikoli my nia pisali ani na kaho „klewiaty". Da Sawietaū my adnosimsia krytyčna i na heta majem padstawy. Biełaruski narodny ruch u Zach. Biełarusi ciapier tolki i abapiorty na tych arhanizacyjach, z jakimi supracoūničaje B. Ch D. K.P.Z.B. nia jość biełaruskaj narodnaj arhanizacyjaj i z joj biełaruskija narodniki twaryć supolnych frontaū nia mohuć. Za biełaruskuju školu B.Ch.D. wiadzie zaūsiody zmahańnie, a ciapier zaklikaje wučycca pabiełarusku i samaadukacyjaj. Radzim i Wam za samaadukacyju ūziacca, dyk nawučyciesia pisać i pabiełarusku. Stydna biełarusam nia ūmieć pisać pabiełarusku. Ale hetamu B.Ch.D. nie winawata. B.Ch.D. zaūsiody i ūsich klića da aświety, jakuju treba zdabywać šlacham školnym abo pazaškolnym.

Беларусы павінны чытаць і пашыраць беларускую прэсу:

1. **„Беларуская Крыніца"** XIX год **„Biełaruskaja Krynica"**, выданьня, палітычны, грамадзкі і літаратурны часапіс, выходзіць што тыдзень. Падпіска на год 4 зл., на паўгода — 2 зл. Адрас: Red. „Biełaruskaja Krynica" Wilno, Zawalna 1—1.

2. **„Самапомач"—„Samapomač"**, IV год выданьня, адзіны ў нас беларускі коопэратыўна-гаспадарскі часапіс, выходзіць рэгулярна што месяц. Падпіска на год 3 зл., на паўгода 1.75. Адрас: Red. „Samapomač", Wilno, Połocka 9—4.

3. **„Шлях Моладзі"**, VII-мы год выданьня, часапіс беларускай моладзі, выходзіць рэгулярна што месяц. Падпіска на год 2 зл., на паўгода 1 зл. Адрас: Red. „Šlach Moładzi", Wilno, Zawalna 1—2.

4. **„Chryścijanskaja Dumka"**, 8-my hod wydańnia, biełaruski katalicki časapis, wychodzić rehularna što miesiac. Padpiska na hod 3 zł., na paūhodu — 1.50 zł. Adras: Red. „Chryścijanskaja Dumka", Wilno, Zawalna 1—2.

5. **„Praleski"**, 1-šy hod wydańnia, biełaruski dziciačy časapis, wychodzić što miesiac. Padpiska na hod 2 zł. Adras: Red: „Praleski", Wilno, Zawalna 1—2.

6. **„Калосьсе"**, 1-шы год выданьня, беларускі літаратурна-навуковы часапіс, выходзіць раз у тры месяцы. Падпіска на год 4 зл. Адрас: Red. „Kałośsie", Wilno, Zawalna 1—2.

Беларуская газэта найтанейшая і найдаступнейшая. Пробныя нумары (апрача „Калосься") на просьбу высылаюцца бясплатна. Пішэце выразна свае адрасы!

Redaktar Jan Paźniak. Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny ū Wilni, Zawalnaja 1 — 2. Wydawiec A. Šutowič.